Источник: "Краязнаўчая газета" - 2017-11-30

# Ліцвіны гвардыі Напалеона




***16 лістапада ў інфармацыйна-выставачным цэнтры Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбылася прэзентацыя кнігі Уладзіміра Лякіна «Ліцвіны гвардыі Напалеона», якая пабачыла свет у 2017 годзе ў выдавецтве «Тэхналогія».***

Кніга знаёміць чытачоў з малавядомай старонкай айчыннай гісторыі, якая распавядае пра ўдзел нашых продкаў у 1807 – 1815 гадах у элітных фармаваннях французскай арміі – гвардыі Напалеона. Яны апынуліся ў адным шыхце пад Імператарскімі арламі з мэтай вярнуць незалежнасць радзіме. Іх бліскучыя перамогі пад Самасьерай, Эслінгам, Ваграмам ды ў іншых бітвах цалкам апраўдваюць словы Напалеона: «Вы вартыя маёй Старой гвардыі! Вы – найлепшая кавалерыя!»

Рухаючыся следам за аўтарам, чытачы трапяць не толькі на палі бітваў у Іспаніі, Расіі, Германіі, Францыі, але і на велічныя парады, пазнаёмяцца са штодзённым жыццём і падрыхтоўкай кавалерыстаў, іх зброяй, стасункамі з вядомымі французскімі камандзірамі і баявымі сябрамі.

У дадатку змешчаныя кароткія біяграфічныя звесткі пра больш за тысячу нашых суайчыннікаў-гвардзейцаў. Шмат хто з дапытлівых чытачоў пазнае сярод іх сваіх прадзедаў.

Незадоўга да сваёй смерці на востраве Святой Алены Напалеон неяк выказаўся: «Трэба напісаць гісторыю маёй гвардыі. Гэтая кніга будзе вечным помнікам, узведзеным у гонар адважных, кім больш за ўсё павінна ганарыцца Францыя». За два мінулыя стагоддзі такіх кніг з'явілася нямала, але даследаванняў па замежных фармаваннях у складзе гвардыі Напалеона – адзінкі. Кніга У. Лякіна з'яўляецца першым на беларускай мове выданнем пра нараджэнцаў Вялікага Княства Літоўскага, якія служылі ў гвардзейскай кавалерыі Напалеона.

***Паводле інфармацыі арганізатараў***